асаблівасцямі мовы. Акрамя таго, уключэнне патрабуе ведання паэтычнага матэрыялу, рытму вершаванай мовы, умення адчуваць розныя памеры верша. У свяце выкарыстоўваюцца розныя прыёмы моўнага дзеяння (моўны хор, меладэкламацыя і г.д.), мікрафоннае «закадравае» чытанне дыктарскага тэксту.

Для авалодання студэнтамі прафесіяй рэжысёра свят у працэсе выкладання прадмета «Моўнае дзеянне» вырашаюцца наступныя задачы:

- асэнсаванне і засваенне тэарэтычных асноў прадмета;
- набыццё практычных навыкаў унутранай і знешняй тэхнікі моўнага дзеяння, выканальніцкага майстэрства ў мастацтве вуснага слова;
- набыццё уменняў метадычнай работы над моўным дзеяннем з улікам спецыфікі ўмоў свята.

Матэрыял прадмета «Моўнае дзеянне» падзяляецца на раздзелы. У першым раздзеле разглядаюцца прадмет і задачы моўнага дзеяння ў свяце, раскрываецца змест дысцыпліны ў агульнай сістэме навучання рэжысёра свят.

Раздзел «Тэхніка мовы» працягледжвае развіццё прыродных дадзеных, выпраўленне моўных недахопаў, валоданне культурай вуснага слова (арфаэпіяй), навучанне «знешняй тэхніцы» моўнага дзеяння.

Матэрыял наступнага раздзела прысвечаны ўнутранай тэхніцы у вусным слове розных яго жанраў і драматургічным матэрыяле.

Матэрыял прадмета ўключае пытанні па авалоданні рэжысёрскімі навыкамі работы ва ўмовах аматарскіх калектываў. Шмат увагі ўдзяляецца слову ў рэжысёрскіх эцюдах, інсцэніроўках па байках і інш. У працэсе выкладання прадмета вывучаецца тэхніка мікрафоннага чытання, раскрываюцца прыёмы «закадравага чытання» тэксту, выкарыстання мікрафона на сцэнічнай пляцоўцы.

Усе раздзелы прадмета між сабой узаемазвязаны, таму што метад авалодвання навыкамі моўнага дзеяння комплексны.

Адным са сродкаў комплекснай трэніроўкі голасу і мовы з'яўляецца гульня. Яна спалучае творчыя і тэхнічныя моманты ў авалодванні навыкамі моўнага дзеяння.

Гуд Н.І.,
ст.выкладчык

## ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ ДА ПРАВЯДЗЕННЯ БЕЛАРУСКАГА КІРМАШУ ЯК ФОРМЫ АРГАНІЗАЦЫІ АДПАЧЫНКУ МОЛАДЗІ

У цяперашні час адной з найбольш актуальных задач па ўдасканаленні адпачынку моладзі з'яўляецца праблема стварэння свята, якое б зацікавіла і захапіла ўсіх.

Найбольш паспяхова дапамагаюць выканаць пастаўленыя задачы святы, якія арыентуюцца на народныя звычаі. Важную ролю ў гэтым адыгрываюць мясцовыя народныя традыцыі, якія бытуюць у наш час ці бытавалі раней і якія захаваліся ў памяці старажылаў. Аднаўленне, ажыўленне ў сучасным жыцці спрадвечных народных традыцый неабходна, таму што фарміруе такія каштоўныя якасці, як любоў да свайго краю, мовы, цікавасць да жыцця свайго народа, яго гісторыі, культуры. Вобразы народнага мастацтва захавалі сваю каштоўнасць, і цікавасць да іх усе больш і больш узрастае.

Прычына такой цікавасці звязана з тым адчуваннем цэльнасці, гарманічнага зліцця з прыродай, якое ўласціва традыцыйным вобразам народнага мастацтва. Спрадвечныя народныя святы могуць стаць перспектыўнай формай адпачынку, абагаціць культуру быту.

Адным з такіх святаў з'яўляецца беларускі кірмаш, які суправаджаў святы каляндарнага цыкла. Маючы свой спецыфічны комплекс забаў і гульняў, на ўсіх этапах свайго гістарычнага развіцця ён быў адной з формаў праяўлення творчай самадзейнасці народа. Першы ў Беларусі кірмаш быў афіцыйна дазволены ўладамі ў 1498 годзе ў Полацку. Затым ён атрымаў распаўсюджанне па ўсіх гарадах і вёсках. Кірмаш спалучаў у сабе гандаль, відовішча і забавы, з-за чаго ў дзеянне ўцягваліся розныя слаі насельніцтва. Хлопцы і дзяўчаты прыходзілі на кірмаш, каб паспяваць, патанцаваць, пагойдацца на арэлях, а таксама выбраць сабе жаніха ці нявесту.

Звычай рабіць кірмаш захаваўся ў Беларусі амаль да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аднак пасля гульнявыя традыцыі кірмашу былі незаслужана забыты. Першая спроба ўзнаўлення традыцыі правядзення кірмашу зроблена ў канцы 30-х гадоў у г.Брэсце. Аднак адраджэнне ў свяце толькі гандлева-відовішчных формаў і адсутнасць народных забаў з'явіліся перашкодай для шырокай папулярызацыі кірмашу. І толькі ў кастрычніку 1981 г. у г. Століне Брэсцкай вобласці пры ўдзеле аўтара была праведзена эксперыментальная пастаноўка адроджанага кірмашу на традыцыйнай народнай аснове. Поспех яго садзейнічаў значнаму пашырэнню геаграфіі свята. Беларускі кірмаш прайшоў у Скідалі, Жыткавічах, Ваўкавыску, Міры, Воранаве.

Пры гэтым кожнае свята было самабытным, арыгінальным, якое захавала дух і традыцыі свайго рэгіёна. У цяперашні час свята праводзіцца ў 30-ці раёнах рэспублікі, арганічна спалучае ў сабе гандаль і мастацкую творчасць моладзі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Састаўнымі элементамі беларускага кірмашу з'яўляюцца ўрачыстае адкрыццё, выстава-продаж вырабаў народных майстроў, фальклорныя фестывалі і спартыўныя спаборніцтвы, конкурсы музыкантаў і выканаўцаў народных песень, народныя атракцыёны, гульні, забавы. У цэнтры народных традыцый заўседы было маладое пакаленне, таму арганізацыя кірмашу дазваляе ўключаць у працэс яго правядзення ў першую чаргу моладзь, што дапамагае развіццю творчай актыўнасці і рацыянальнаму выкарыстанню яе вольнага часу.

Міцкевіч Н.А.,
ст.выкладчык

## МЕТАДЫЧНАЯ РАСПРАЦОЎКА ГРАТЭСКУ Ў РЭЖЫСУРЫ НУМАРА

Гратэск - від мастацкай вобразнасці, заснаваны на камічным, карыкатурным, трагічным эфекце. Гратэскавы тып вобразнасці - метад пабудовы вобразаў. На думку К.С.Станіслаўскага, гратэск, - «вышэйшая ступень нашага мастацтва». Не прызнаючы гратэск бездухоўны, спрошчаны і апошлены, ён сцвярджаў гратэск яскравы, смелы, здольны апраўдаць вялікі ўнутраны змест. Нумар з'яўляецца самастойнай адзінкай сцэнічнага дзеяння. Ен праяўляе сябе ў тэатралізаваным відовішчы праз гратэск.

Эксцэнтрычнасць, парадаксальнасць рэжысёрскага мыслення з'яўляюцца асновай метадычнай распрацоўкі гратэску ў рэжысуры нумара. У тэатралізаваным відовішчы нумар праяўляецца праз алегарычную пантаміму, клаунаду, буфанаду, скетч і іншыя формы гратэскавага формаўтварэння.

У чым сутнасць метадычнага падыходу да сцэнічнай формы? У момант рэжысёрскай пабудовы гратэскавага нумара неабходна праяўляць давер да гледача і пазбягаць роўных хадоў, павучанняў, прымітыўных высадаў. У метадычным падыходзе да распрацоўкі гратэску ў нумары студэнт, будучы рэжысер, з'яўляецца першаадкрывальнікам; ен павінен даследаваць невядомы, неспазнаны жыццёвы матэрыял, акрэсліць шэраг праблем, задач, выявіць скразное дзеянне. Пры стварэнні гратэскавага нумара аўтар - студэнт павінен вызначыць сваю палітычную, сацыяльную, грамадзянскую пазіцыю, раскрыць свае маральныя і духоўныя якасці.

Такім чынам, рэжысура гратэскавых нумароў будуецца «па сваіх законах». Тут смела выкарыстоўваюцца гіпербала, шарж, фантастычная трансфармацыя і інш.

Рэжысура гратэскавых нумароў патрабуе не толькі арганізацыі прасторы, але і музычнага дзеяння. Для гэтых нумароў характэрны ланцуг вострасюжэтных дзеянняў, эксцэнтрыка, маскі, якія ўяўляюць сабой сацыяльную тыпізацыю.

Трэба адзначыць, што гратэск у рэжысуры нумара - своеасаблівая гульня супрацьлегласцей. Мастацтва рэжысуры гратэскавага нумара - гэта мастацтва дзеяння. Студэнт-рэжысёр, выкарыстоўваючы сцэнарый, стварае новы, каштоўны твор мастацтва. Безумоўна, студэнт - рэжысер як творца нумара павінен даць гледачу вялікую інфармацыю культурнага і выхаваўчага парадку.

Метадычная распрацоўка гратэскавага нумара выяўляе не толькі веды студэнта-рэжысёра, але і выяўляе яго творчыя і арганізацыйныя здольнасці, а таксама назапашаны жыццёвы вопыт.

Аладаў Г.М.,
дацэнт

## МЕТОДЫКА ПРАВЯДЗЕННЯ РУХОМЫХ ГУЛЬНЯЎ

Пры выбары гульняў патрэбна ўлічваць форму мерапрыемстваў (вечар адпачынку, тэматычны вечар, дзіцячае свята, народнае свята і г.д.), месца іх правядзення (зала, вуліца, парк), час правядзення (зіма, лета), узрост удзельнікаў, іх колькасць.

Для правядзення гульняў неабходна падрыхтаваць пляцоўку, інвентар. Пажадана, каб інвентар быў маляўнічым, яркім, прыкметным. Па памеру ён павінен адпавядаць фізічнай падрыхтоўцы ўдзельнікаў.

Колькасць інвентару неабходна прадугледзець загадзя. Ён раздаецца ўдзельнікам ці раскладваецца пасля тлумачэння гульні. Перад гульнёй неабходна прадумаць увесь яе працэс і прадугледзець, якія моманты могуць выклікаць азарт, зніжэнне зацікаўленасці, каб папярэдзіць гэтыя нежаданыя з'явы.

Перад тым, як растлумачыць гульню, неабходна так размясціць удзельнікаў, каб яны добра бачылі і чулі вядучага. Тлумачэнне павінна быць сціслым. Выключэнне складаюць гульні для дзяцей, якія можна тлумачыць у казачнай, займальнай форме. Тлумачэнне павінна быць лагічным, паслядоўным. Рэкамендуем прытрымлівацца наступнага плана тлумачэння. 1. Назва гульні. 2. Роля гуляючых і іх размяшчэнне. 3. Ход гульні. 4. Мэта гульні. 5. Правілы гульні.

Для лепшага засваення правіл тлумачэнне патрэбна суправаджаць паказам. Ён можа быць поўным (узнаўляюцца найбольш складаныя моманты гульні) ці няпоўным (некаторыя моманты гульні растлумачваюцца жэстамі і асобнымі рухамі).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ